| | | |
|---|---|---|
| ЗАЦВЯРДЖАЮ<br>Прарэктар па выхаваўчай і сацыяльнай працы<br>_______ І.Г. Матыцына<br>«___» _________ 2015 г. | ЗАЦВЯРДЖАЮ<br>Старшыня прафкама студэнтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна<br>_______ Р.В. Чуль<br>«___» _________ 2015 г. | ЗАЦВЯРДЖАЮ<br>Дэкан філалагічнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна<br>_______ В.А. Фелькіна<br>«___» _________ 2015 г. |

# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ АДКРЫТАЙ ФОТАВЫСТАВЕ “ПЕРШАЦВЕТ”

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Фотавыстава “ПЕРШАЦВЕТ” праводзіцца ў рамках рэалізацыі мерапрыемстваў Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (на 2011–2015 гг.) і з’яўляецца **адкрытай**. У ёй могуць прыняць удзел студэнты розных факультэтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна, вучні агульнаадукацыйных установ Брэсцкай вобласці.

## АРГАНІЗАТАР ФОТАВЫСТАВЫ

**Арганізатарамі** адкрытай фотавыставы “Першацвет” з’яўляюцца кафедра журналістыкі філалагічнага факультэта, прафсаюзны камітэт студэнтаў Установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна».

## АРГКАМІТЭТ ФОТАВЫСТАВЫ

1. Фелькіна В.А. – дэкан філалагічнага факультэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
2. Скібіцкая Л.В. – загадчык кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Клундук С.С. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
4. Смаль В.М. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
5. Чуль Р.В. – старшыня прафкама студэнтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна.

## МЭТА І ЗАДАЧЫ ФОТАВЫСТАВЫ

**Мэта** фотавыставы – актуалізаваць увагу да праблемы дэмаграфічнай бяспекі дзяржавы.

**Задачы** фотавыставы:

– выявіць зацікаўленасць сучаснай моладзі да праблематыкі дэмаграфічнай сітуацыі;

– вызначыць узровень фотамайстэрства ўдзельнікаў выставы.

## УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ФОТАВЫСТАВЫ

Фотавыстава праводзіцца ў 2 этапы:

1. першы этап – “Мои года – мое богатство” (да Дня пажылых людзей) – з 30.10.2015 па 12.11.2015 года;
2. другі этап “Праздник детства” (да Міжнароднага дня абароны дзяцей) – з 02.05.2016 па 13.05.2016.

Для ўдзелу ў **першым** этапе фотавыставы **да 30 кастрычніка 2015 года** неабходна даслаць:

1. **заяўку** на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by), якая ўтрымлівае ўсе неабходныя звесткі пра ўдзельніка (прозвішча, імя, імя па бацьку; навучальная ўстанова, факультэт, група, клас; кантактны тэлефон) (форма заяўкі прыкладваецца);
2. **фотаздымак/фотаздымкі** ў электронным варыянце на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by);
3. **фотаздымак/фотаздымкі** ў раздрукаваным варыянце фармату А4 на адрас: 224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28; каб. 307 вучэбнага корпуса № 2).

Для ўдзелу ў **другім** этапе фотавыставы **да 30 красавіка 2016 года** неабходна даслаць:

1. **заяўку** на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by), якая ўтрымлівае ўсе неабходныя звесткі пра ўдзельніка (прозвішча, імя, імя па бацьку; навучальная ўстанова, факультэт, група, клас; кантактны тэлефон) (форма заяўкі прыкладваецца);
2. **фотаздымак/фотаздымкі** ў электронным варыянце на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by);
3. **фотаздымак/фотаздымкі** ў раздрукаваным варыянце фармату А4 на адрас: 224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28; каб. 307 вучэбнага корпуса № 2).

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ФОТАВЫСТАВЫ

Фотавыстава дасланых прац **першага** этапу будзе працаваць з 30.10.2015 года па 13.11.2015 года ў аўдыторыі 322 філалагічнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна (вул. Міцкевіча, 28, вучэбны корпус № 2, 3 паверх).

Фотавыстава дасланых прац **другога** этапу будзе працаваць з 02.05.2016 года па 13.05.2016 года ў аўдыторыі 322 філалагічнага факультэта

БрДУ імя А.С. Пушкіна (вул. Міцкевіча, 28, вучэбны корпус № 2, 3 паверх).

Ацэньвае працы ўдзельнікаў і падводзіць агульныя вынікі **журы** ў наступным складзе:

1. Скібіцкая Л.В. – загадчык кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
2. Клундук С.С. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Смаль В.М. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
4. Сенькавец У.А. – загадчык кафедры беларускага літаратуразнаўства, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Пераможцы **першага** этапу фотавыставы (па запрашэнні аргкамітэта) узнагароджваюцца падчас правядзення рэгіянальнага вучэбна-метадычнага семінара "Прафесія – журналіст" (**13.11.2015 г.**).

Пераможцы **другога** этапу фотавыставы (па запрашэнні аргкамітэта) узнагароджваюцца падчас правядзення рэгіянальнага навукова-практычнага семінара "Рэгіянальныя СМІ ў сучаснай медыйнай прасторы" (**13.05.2016 г.**).

## ФІНАНСАВАННЕ МЕРАПРЫЕМСТВА

Пераможцы конкурсу, якія занялі 1, 2, 3 месцы ў кожным этапе, узнагароджваюцца падарункамі, прадстаўленымі прафкамам студэнтаў.

## КАНТАКТЫ

Адрас кафедры: kafjurn@brsu.brest.by

Кантактныя тэлефоны: + 8 (016) 21 63 50 – кафедра журналістыкі; + 375 29 724 30 85 – Клундук Святлана Сяргееўна – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.